**Г.М. Канцавая**
Брэст, БрДУ імя А.С. Пушкіна

## ПРЫКАЗКІ І ПРЫМАЎКІ ЯК АДЛЮСТРАВАННЕ НАЦЫЯНАЛЬНАГА МЕНТАЛІТЭТУ БЕЛАРУСАЎ

Слова *менталітэт* паходзіць ад познелацінскага mentalis, што абазначае *разумовы.* У.В. Колесаў прапануе наступную трактоўку паняцця *менталітэт*: «Менталіэт у сваіх прыметах ёсць наіўна цэласная карціна свету ў яе каштоўнасных арыенцірах, якая існуе працяглы час, незалежна ад канкрэтных эканамічных і палітычных умоў, заснаваная на этнічных схільнасцях і гістарычных традыцыях; менталітэт праяўляецца ў пачуццях, розуме і волі кожнага асобнага члена грамадства на аснове агульнасці мовы і выхавання і ўяўляе сабой частку народнай духоўнай культуры, якая стварае этнаментальнаую прастору народа на данай тэрыторыі яго існавання» [1, с. 15].

У вузкім разуменні менталітэт – гэта тое, што дазваляе аднастайна ўспрымаць навакольную рэчаіснасць, ацэньваць яе і дзейнічаць у ёй у адпаведнасці з пэўнымі нормамі паводзін, адэкватна ўспрымаючы і разумеючы пры гэтым адзін аднаго.

Выпрацоўваючыся гістарычна і генетычна, менталітэт утварае тую духоўна-паводзінскую спецыфічнасць, якая робіць прадстаўнікоў аднаго народа непадобнымі да прадстаўнікоў іншых народаў, і з прычыны чаго ён становіцца важным фактарам самаідэнтыфікацыі той ці іншай супольнасці. Менталіэт народа заўжды нясе на сабе адбітак нацыянальнага, асацыіруючыся з такімі паняццямі, як нацыянальная свядомасць, нацыянальны характар, народны дух і г.д.

Нацыянальны менталітэт, на нашу думку, – гэта ўласцівая нацыі «сістэма каштоўнасцяў, поглядаў, светапогляду, рыс характару, нормаў паводзін» [2, с. 9], якая вызначаецца нацыянальнымі звычаямі; гэта вобраз і спосаб мыслення моўнага калектыву, светаадчуванне і светаўспрыманне, адлюстраванае ў мове.

Носьбіты беларускага менталітэту не заўважаюць і не задумваюцца над тым, што ён сказваецца на бачанні свету, на напрамку думак. Менталітэт стаіць за кожным учынкам асобы і раскрываецца праз сістэму поглядаў і ацэнак, нормаў настрою думак, якія заснаваны на ведах і вераваннях; мову, аналіз якой дазваляе вельмі дакладна выявіць культурную спецыфіку адносін людзей да навакольнага свету і ўяўляе ўнутраны свет чалавека; дамінуючыя ў данай групе матывы, праз іерархію каштоўнасцяў, якія праяўляюцца ў перакананнях, ідэалах і цікавасцях; эмацыянальную сферу, праз панаванне якіх-небудзь пачуццяў [3, с. 53].

Менталітэт беларусаў адлюстроўваецца ў асаблівасцях іх быту, гісторыі, культуры, традыцый, звычаяў, а галоўным чынам у сістэме розных адзінак маўлення, з дапамогай якіх людзі ўзаемадзейнічаюць адзін з адным. Найбольш поўна менталітэт беларускага народа выражаецца ў прыказках і прымаўках, якія рэагуюць на ўсе з'явы рэчаіснасці, адлюстроўваюць жыццё і светапогляд народа ва ўсёй яго шматстайнасці. Яны перадаюць бытавыя, сацыяльныя, філасофскія, маральна-этычныя, эстэтычныя народныя погляды. Галоўнае прызначэнне прыказак і прымавак – даваць народную ацэнку з'явам рэчаіснасці, выражаючы тым самым светапогляд. Прыказкі і прымаўкі ахопліваюць амаль усе бакі жыцця чалавека, самыя розныя ўзаемасувязі паміж рознымі з'явамі рэчаіснасці.

Народныя выслоўі з'яўляюцца таксама найважнейшым матэрыялам для вывучэння гістарычных падзей, этнаграфіі, светапогляду. Вытрымаўшы ацэнку часам, яны арганічна зліліся з маўленнем, упрыгожваюць яго дасціпнасцю, здольнасцю трапна і дакладна характарызаваць усе шматлікія праяўленні жыцця.

У ходзе даследавання мы выкарыстоўвалі наступныя парэміялагічныя зборнікі: «Прыказкі і прымаўкі» [4–5], «Беларускія прыказкі і прымаўкі, фразеалагізмы» [6], «Слова міма не ляціць» [7].

Самая галоўная каштоўнасць для беларусаў – гэта праца. У многіх прыказках і прымаўках гаворыцца пра тое, што яна ўзвышае чалавека, надае яму высакароднасць: *Праца чалавека трымае і ўзбагачае; Праца нікога не крыўдзіць; Работа чалавека не ганіць; Работа не бясчэсціць чалавека, а крэпіць і цешыць; Чалавек слаўны працай; Дрэва пазнаюць па пладах, а чалавека – па справах; Чалавек жыве век, а добрае дзела два.*

Дзякуючы працы, беларускі чалавек набывае радасць, шчасце, задавальненне. Безумоўна, любая праца патрабуе намаганняў, і беларус, працалюбівы, цярплівы і паслухмяны чалавек, разумее, што нічога не даецца проста так, усюды трэба прыкладаць намаганні: *Каб рыбу есці, трэба ў ваду лезці; Трэба нахіліцца, каб з ручая напіцца; Не раскусіўшы арэх, зерне не з'ясі; Само нішто не прыходзіць у рукі; Без працы з неба кашка не будзе сыпацца; Без мазаля на руках не будзеш мець хлеба ў зубах; Вось на свеце як бывае: хто працуе, той і мае; Па дарозе ідучы, грыбоў не набярэш; Каб вады напіцца, трэба ёй пакланіцца; Вады не засіліш, не паварушыўшыся, рыбы не зловіш, не памачыўшыся.*

Не застаюцца без ўвагі і лянівыя людзі, гультаі, для якіх праца не ў радасць, а ў цяжар: *Працаваць не любіш – чалавекам не будзеш*; *Няма горшага калецтва, як гультайства; Гультайства губіць хазяйства; Гультайства горш за хваробу*. Не любяць беларусы ляніцца, не ў павазе тыя, хто за чужую працу карміцца: *Пусці яго на шыю, ён і на галаву забярэцца; Дарма хлеб пераводзіць; Мяккія рукі чужы хлеб у рот кладуць, а свой пячы*

*не ўмеюць; Дай яму яечка, ды яшчэ каб аблупленае; Дармаед у народзе што пустазелле на полі ці ў агародзе.*

Хата ў традыцыйнай свядомасці народа – гэта не толькі пабудова ці дах над галавой, але і жыллё як для цела, так і для духу: *Свая хатка як родная матка*; *Слаўна хата не вугламі, а пірагамі; Свая стрэха – свая ўцеха.* Хата ўвасабляе сабой замкнутую прастору, абмежаваную ад знешняга свету і ад душэўных хваляванняў: *У сваёй хаце і вуглы памагаюць; У сваёй хаце і качарга маці; Дома добрая пасцель і салома.*

Мы назіраем любоў да роднай хаты – да самага лепшага месца на ўсёй зямлі: *У гасцях добра, а дома лепш; Свая рубашка бліжэй да цела; Усякі кулік сваё балота хваліць*. Сям'я – гэта нейкая свяшчэнная аснова чалавечага дабрабыту: *Уся сям'я ўмесце, і душа на месце; У дружнай сям'і і ў холад цёпла; Дрэва трымаецца каранямі, а чалавек сям'ёй.*

Свяшчэннай для беларускага народа з'яўляецца Радзіма. Для беларуса Радзіма, родная зямля заўсёды былі чымсьці вельмі важным, каштоўным, для беларуса гэта тое, без чаго чалавек не можа жыць: *Дзе нарадзіўся, там і згадзіўся; Чалавек без радзімы – салавей без песні; У гасцях добра, а дома лепш. У сваім краі, як у раі*; *Дарагая тая хатка, дзе радзіла мяне матка; Беражы зямлю радзімую, як маці любімую; Радзіма – матка, чужына – мачыха; Лепш нічога няма свайго роднага вугла; Родная зямля – маці, чужая старонка – мачаха.*

У беларускай культуры ёсць словы *Айчына, Бацькаўшчына: Бацькаўшчыны не купляюць і не прадаюц; Для сваёй Айчыны не шкадуюць сілы; Той Бацькаўшчыну любіць, хто ёй сумленна служыць.*

Аналіз праказкавага фонду беларускай мовы сведчыць пра высокую ступень патрыятызму беларускага народа: *Жыць на чужой старонцы, як на скале адзінокай сасонцы; На чужой старане і вясна не красна; На чужой старане і на печы холадна*; *У чужой старонцы не так свеціць і сонца.* Беларускі чалавек адчувае сябе чужым на «другой» зямлі, падтрымлівае сваю Радзіму і любіць яе: *Лепей гніць у магіле, чым жыць у чужыне; Ідзі ў родны край, там і пад елкаю рай; Чужбіна не грэе; Чужына па шэрсці не гладзіць.*

Адносіны чалавека да носьбітаў «іншага», «незнаёмага» паказваюць і яго адчуванне прыналежнасці да роднага і нацыянальнага, што таксама з'яўляецца элементам нацыянальнага вобраза свету: *Дзе сасна не стаіць, а ўсё свайму бору шуміць; Кожная сасна свайму бору песню пяе; Чужбіна не родная матка: хлеба не дасць; На чужбіне і камар загіне; Чужая старана – цёмны лес; На чужой старане і сокала завуць варонай; Свет прайшла і назад вярнулася.*

Як вядома, у жыцці вельмі многае залежыць ад акружэння, у якое мы трапляем; яно моцна ўплывае на чалавека, таму неабходна акуратна

выбіраць кампанію: *З кім павядзешся, ад таго і набярэшся; Скажы, хто твой таварыш, я скажу, хто ты; З астрожнікам спазнайся – хутка да астрогу сам збірайся; Ліхая кампанія і добрага папсуе.*

Міжасобасныя зносіны павінны будавацца на даверы і жаданні дапамагчы адзін аднаму ў складаных сітуацыях. Таксама прыказкі і прымаўкі вучаць таму, каб чалавек адносіўся да людзей так, як яны адносяцца да яго; жыццё ўяўляецца як бумеранг: *Жыццё любіць таго, хто любіць яго; Што пасееш, тое і пажнеш; Вока за вока, зуб за зуб; Не рый яму іншаму – сам у яе трапіш; Любіш браць – любі і аддаць.*

З асаблівай значымасцю цэніцца сяброўства: *Сябры пазнаюцца ў бядзе; Сяброўствам трэба даражыць: сапраўднага сябра за грошы не купіш; Стары друг лепей за новых двух; Сябрамі не кідаюцца; Дружбу ні каменем цвёрдым, ні сцяною высокаю не мераюць.*

З малых гадоў нас вучаць, што знешнасць часта падманлівая, і судзіць людзей трэба па іх справах і ўчынках*: У ціхім віры чэрці водзяцца; Усе птушкі крыламі махаюць, ды не ўсе лятаюць; Праца корміць, а лянота псуе.*

У той жа час прыказкі звяртаюць увагу на маўклівых людзей, папярэджваючы пра магчымую бяспеку з іх боку: *Не бойся сабакі звяглівага, а бойся маўклівага; Не бойся ліхога, а бойся ціхога; Не бойся таго, хто крычыць, а бойся таго, хто маўчыць.*

Аднак да людзей трэба адносіцца памяркоўна, спагадліва, выбачаючы ім памылкі: *Чужое бачыць пад лесам, а свайго не бачыць і пад носам; У чужым воку і парушынку ўгледзім, а ў сваім і калоды не пабачым; Свайго горба ніхто не бачыць; Даранаму каню ў зубы не глядзяць; Вышэй галавы не скочыш.*

Таксама ў прыказках і прымаўках робіцца акцэнт на тое, што чалавек свабодны ў выбары свайго жыццёвага шляху: *Усякі чалавек свайму шчасцю каваль.*

Адно з галоўных месцаў у нацыянальным характары беларусаў займаюць адносіны да працы, да разумовай ці фізічнай дзейнасці. Гэта можа гаварыць пра працавітасць і руплівасць носьбітаў беларускай культуры. Настойлівасць і мэтанакіраванасць закладзены ў свядомасці беларускага народа: *Скончыў справу, гуляй смела; Калі хочаш, каб было зроблена добра, зрабі сам; Што пасееш, тое і пажнеш; Вочы баяцца, а рукі робяць; Вада камень точыць; Хто шукае, той заўжды знаходзіць.*

Тым не менш, калі чалавек не ўпэўнены ў сваіх сілах, магчымасцях, прыказкі заклікаюць не брацца за гэтую справу, бо вынік можа быць сумным*: За ўсё брацца – нічога не зрабіць; За двума зайцамі пагонішся, ніводнага не зловіш; Вышэй галавы не скочыш.*

Беларускі народ гасцінны і хлебасольны. Лічыцца, што госці нясуць у хату радасць і вяселле, яны падарунак, які дадзены Богам чалавеку, таму

госць мае пачэснае месца: Гасцей сустракаюць хлебам-соллю, бо хлеб і соль вельмі каштоўныя для беларусаў: *Дзякую за хлеб, соль, за бульбу і кашу, дзякую і за дабрату вашу.*

Характар беларусаў адлюстраваны ў наступных прыказках і прымаўках*: Хоць не багатыя, а гасцям радыя; Госць на парог – шчасце ў дом; Чым багаыя, тым і рады; Чым хата багата, тым і рада; Хоць я не багаты, а з гасцей рады; Прысядзь – госцем будзеш; За гасцямі і нам добра.*

Такім чынам, прыказкі і прымаўкі з'яўляюцца неад'емнай часткай беларускай культуры, даюць ключ да разумення нацыянальнага менталітэту беларускага народа, а таму да сённяшняга часу выкарыстоўваюцца намі ў паўсядзённым жыцці.

Спіс выкарыстанай літаратуры

1. Колесов, В. В. Язык и ментальность / В. В. Колесов. – СПб. : Петербургское востоковедение, 2004. – 240 с.

2. Крысько, В. Г. Этнопсихологический словарь / Крысько, В. Г. [и др.]. – Москва : МПСИ, 1999. – 343 с.

3. Щеглова, Л. В. Этнокультурология в истории и повседневности: учеб. пособие / Л. В. Щеглова, Н. Б. Шипулина, Н. Р. Саенко. – Волгоград : Перемена, 2008. – 230 с.

4. Прыказкі і прымаўкі ; у 2 кн. Кн. 1 ; рэд. А. С. Фядосік. – Мінск : Навука і тэхніка, 1976. – 560 с.

5. Прыказкі і прымаўкі ; у 2 кн. Кн. 2 ; рэд. А. С. Фядосік. – Мінск : Навука і тэхніка, 1976. – 616 с.

6. Беларускія прыказкі, прымаўкі, фразеалагізмы ; склаў Ф. Янкоўскі. – Мінск : Навука і тэхніка, 1992. – 491 с.

7. Ліцвінка, В. Д. Слова міма не ляціць : Беларус. нар. прыказкі і прымаўкі / В. Д. Ліцвінка, Л. А. Царанкоў. – Мінск : Універсітэцкае, 1985. – 149 с.